# Майстар-клас
# ад часопіса
# «Народная асвета»

**Паважаныя калегі!**

У рамках акцыі «Часопіс «Народная асвета» – у кожную школу Беларусі!» рэдакцыя запрашае ўсіх зацікаўленых прыняць удзел у майстар-класе «Інфармацыйная культура педагога: падрыхтоўка матэрыялаў да публікацыі ў навукова-метадычным часопісе».

***Падчас майстар-класа вы навучыцеся:***

- выкарыстоўваць інфармацыйна-метадычныя рэсурсы часопіса «Народная асвета» для павышэння ўзроўню сваёй прафесійнай кампетэнтнасці;
- абагульняць вопыт работы школы і настаўніка для адлюстравання ў педагагічных СМІ;
- эфектыўна прымяняць алгарытм падрыхтоўкі навукова-метадычнага артыкула.

Майстар-клас праводзіцца для намеснікаў дырэктара школ, гімназій, ліцэяў, метадыстаў ВМК, настаўнікаў, якія працуюць над абагульненнем свайго педагагічнага вопыту (у тым ліку па выніках інавацыйнай дзейнасці).

У праграму майстар-класа ўключана прэзентацыя часопіса (знаёмства з інфармацыйна-метадычнымі рэсурсамі розных рубрык, спецыфікай падбору і рэдагавання матэрыялаў па абагульненні вопыту работы настаўнікаў і ўстаноў адукацыі ў цэлым, інавацыйных пляцовак, рэсурсных цэнтраў), а таксама практычныя заняткі з педагогамі па падрыхтоўцы тэкстаў артыкулаў для публікацыі ў педагагічных СМІ. Сустрэчы з зацікаўленай аўдыторыяй праводзяць рэдактары часопіса «Народная асвета».

**Сябруйце з «Народнай асветай» –**
**і вы заўсёды будзеце на вяршыні**
**педагагічнай навукі і практыкі!**